Беларусь.info

№87 5/06/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Еўрапейскія амбасадары прыйдуць на суд над Казуліным.** Амбасадары краінаў Еўрасаюза і прадстаўнікі мінскага офіса АБСЕ маюць намер прысутнічаць на судовым працэсе па справе экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна, які павінен пачацца заўтра ў судзе Маскоўскага раёну Мінска. Аб гэтым паведаміў Тыльман Шміт-Нойербург — прэс-сакратар амбасады Нямеччыны, якая прадстаўляе старшыню ЕС у Беларусі.

**Партыя БНФ і АГП з агаворкамі падпісалі Дэкларацыю "Свабоду Казуліну!"** Ад Партыі БНФ Дэкларацыю грамадзкай камісіі "Свабоду Казуліну!" падпісаў старшыня Вінцук Вячорка, ад АГП — намесьніца старшыні Людміла Гразнова. Яны далучыліся да дэкларацыі на ўмовах, што гэтая грамадзкая камісія будзе называцца "Свабоду палітычным вязьням Беларусі", і яе дзейнасьць будзе шырэйшая.

**У верасні парламент Нямеччыны разгледзіць праект рэзалюцыі аб падтрымцы дэмакратычнага руху ў Беларусі.** Раней планавалася, што праект рэзалюцыі будзе разгледжаны ў чэрвені. У дакуменце змешчаны заклік да ўрада падаць часовы дазвол на працаўладкаванне ў Нямеччыне беларусам, якія страцілі работу ў сувязі са сваёй дэмакратычнай дзейнасцю, а таксама стыпендыі беларускім студэнтам. Апроч гэтага, прапаноўваецца пашырыць кантакты з Беларуссю ў сферы навукі і культуры і прызначыць адмысловага ўпаўнаважанага па Беларусі.

**Белтэлерадыёкампанія пачала замяшчаць некаторыя праграмы тэлеканалу НТВ.** У ліпені ўступіла у сілу дамова паміж двума кампаніямі. Паводле дакументу, НТВ перадала Белтэлерадыёкампаніі права на выкарыстанне ўсіх выпускаў праграмаў, якія выходзяць у эфір на канале ў межах ліцэнзійнага тэрміну, за выключэннем тых праграмаў, на якіх правы не перадаюцца. Белтэлерадыёкампанія замяшчае некаторыя праграмы, фільмы і спартовыя перадачы расійскага каналу. Змены закрануць тыя праекты, якія не з'яўляюцца ўласным прадуктам НТВ.

# Факты

**У войска ізноў будуць прызываць афіцэраў -"двухгадавікоў".** Цяпер, згодна з новым прэзыдэнцкім указам будуць прызываць у войска афіцэраў запасу, якія ў свой час скончылі вайсковыя катэдры ва ўнівэрсітэтах. Прызываць будуць толькі на першасныя пасады па найбольш дэфіцытных спэцыяльнасьцях – напрыклад, эканамістаў, фізыкаў, юрыстаў, журналістаў. Узрост афіцэра-прызыўніка не павінен перавышаць 27 год.

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org